View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Урок 51. Генрых Далідовіч «Страта». Знаёмства з галоўнымі героямі апавядання

**Мэты і задачы ўрока:** дапамагчы вучням разгледзець дзве першыя часткі апавядання, высвятліць рэальна-жыццёвую яго аснову, спрыяць знаёмству з героямі — Стасем і Міцем Бокуцем, назапашванню матэрыял для аналізу вобраза навічка-пяцікласніка Міці (падрабязнае дэталёвае апісанне яго знешнасці, паводзін на ўроках і дома, размовы бацькоў Стася і вяскоўцаў пра сям'ю Бокуцяў і Міцеву хваробу і інш.); развіваць звязнае маўленне, навыкі выразнага чытання, эмацыянальнасць; выхоўваць пачуцце сяброўства, павагі, узаемадапамогі, сродкамі матэрыялу ўрока аказаць уплыў на фарміраванне ўнутранага свету вучняў, садзейнічаць выхаванню культуры індывідуальнай і калектыўнай вучэбнай дзейнасці, спрыяць засваенню паняцця «тактоўнае стаўленне».

**Тып урока** — урок камбінаванай будовы.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік «Беларуская літаратура. 5 клас»; выстава кніг Генрыха Далідовіча.

**Эпіграф да ўрока**

*Дружба – вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць… Дружба робіць вялікія справы. І ў няшчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека. Вырастайце вялікія і аберагайце праз усё жыццё дружбу.*

*Кузьма Чорны*

Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Праверка дамашняга задання**

*– Зачытванне цытатных характарыстык Кастуся і дзеда Агея.*

*– Заслухоўванне лістоў да сяброў і сачыненняў-мініяцюр.*

*– Заслухоўванне вусных замалёвак вучняў пра жыццёвы выпадак, удзельнікам або сведкам якога яны былі.*

**3. Паведамленне тэмы, вызначэнне мэт і задач урока**

Давайце прачытае эпіграф да нашага сённяшняга ўрока – словы беларускага пісьменніка Кузьмы Чорнага і падумаем, чаму пісьменнік надаваў такое вялікае значэнне дружбе?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сябры ёсць у кожнага з нас, але ці часта задумываемся мы над пытаннем, што такое сапраўднае сяброўства? Якім павінен быць сапраўдны сябар? Гэтае праблема хвалюе чалавецтва ўжо доўгі час. Многія пісьменнікі звярталіся да гэтай тэмы: Анатоль Кудравец, чый твор “Цітаўкі” пра сяброўства паміж старым дзедам Агеем і хлопцам Кастусём мы вывучалі на папярэдніх занятках, і Кузьма Чорны, аповесць “Насцечка”, з якой узяты эпіграф, мы будзем чытаць у наступным годзе, і Васіль Быкаў, і Іван Шамякін і многія іншыя. Сёння на ўроку мы пазнаёмімся з героямі апавядання Генрыха Далідовіча Стасем і Міцем.

**4. Вывучэнне новага матэрыялу**

**Чытанне 1 і 2 частак апавядання настаўнікам (с. 70–78)**

**Слоўнікава-лексічная работа**

*Слоўнічак*

*Бабіна лета* – перыяд па-летняму цёплага і сухога надвор’я восенню.
*Скасавурваў вока* – коса, потайкам глядзець.
*Цяльпук* – нязграбны, непаваротлівы; тут: спакойны.
*Суравыя ніткі* – грубыя самаробныя ніткі.
*Дратва* – тоўстая насмоленая або навошчаная самаробная нітка для шыцця абутку, конскай вупражы і інш.
*Атава* – трава, што вырасла ў той жа год на месцы скошанай.
*Лейкоз* – лейкемія, белакроўе, злаякаснае захворванне крыві, пры якім рэзка павялічваецца колькасць лейкацытаў.

**Вывучэнне чытацкага ўспрымання**

– Якое ўражанне пакінулі ў вас першыя дзве часткі апавядання Генрыха Далідовіча «Страта»? Чаму?

– Што вы даведаліся пра сям’ю Бокуцяў у пачатку твора.
– Чым вылучаўся Міця Бокуць сярод янкавінскіх дзяцей? Зачытайце радкі з тэксту, дзе падаецца апісанне хлопчыка (с. 70–71).

**Аналітычная гутарка**

1. Якім вучнем быў Міця? Як ён паводзіў сябе на першым уроку ў новым класе?

2. Раскажыце пра “першы” ўрок навічка. Чым хлопчык адрозніваўся ад іншых вучняў, як паводзіў сябе на ўроку?

3. Ці спадабаўся Міця Стасю? Чаму?

4. Як павёў сябе навічок, калі нехта кінуў у яго кавалачак гліны?

5. Зачытайце словы настаўніцы, адрасаваныя вучням, як вы разумееце яе словы і рэакцыю на іх Стася (с. 74).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Чым займаліся ў вольны час вясковыя хлопчыкі? Што ім давала гэтая гульня? Знайдзіце і зачытайце адпаведныя радкі (с. 74–75).

7. Як аўтар апісвае Міцю, які адпачываў у садзе? Зачытайце радкі з твора (с. 75–76).

8. Чаму Міця адмовіўся гуляць з хлопчыкамі ў футбол? Як хлопчыкі паставіліся да Міці, калі даведаліся, што ён не ўмее гуляць у футбол?

9. Як успрыняў Стась навіну пра невылечную хваробу Міці? Якое рашэнне ён прыняў? Зачытайце апошні абзац 2 часткі (с. 78).

**5. Замацаванне вывучанага**

**Складанне цытатнай характарыстыкі Міці па першай частцы твора**

1. мой аднагодак; пяцікласнік;
2. апрануў руды плашчык; шалік адпаведнага колеру; карычневую кепачку з чорным гузікам наверсе;
2. не ранец, а чорны скураны партфель;
3. быў у акулярах, надзвычай белы;
4. адзенне, партфель, акуляры рабілі Міцю сур'ёзным, разумным і сталым – ледзь не маларослым дзядком;
5. паклаўшы, як першакласнік, рукі на парту, выпрамлена сядзеў;
6. адзін з усяго класа мае на руцэ гадзіннік;
7. быў сур'ёзны, глыбакадумны;
8. гаварыў ціха, але абдумана, ясна;
9. я і сам пішу вершы;
10. гэты навічок – не ганарлівец ды задзірака, а цяльпук.

**Складанне цытатнай характарыстыкі Міці па другой частцы твора**

1. у кепачцы, у плашчыку, ён сядзеў на нейкім дзіўным, крэсле, гайдаўся ўперад-назад, трымаючы на каленях загорнутую кнігу;
2. вочы яго былі заплюшчаныя, твар задуменны;
3. Міця, відаць, быў у палоне нейкай узнёсласці і зацікаўленасці;
4. твар, рукі яго бялеліся, быццам злепленыя са снегу;
5. я яшчэ не ўсе вывучыў урокі;
6. усё трэба вывучыць, зразумець вельмі ясна, – без крыўды, але па-сталаму сур’ёзна адказаў той. Вывучыш, зразумееш – навучышся думаць, разважаць, усё будзеш схопліваць на хаду. Мозг свой трэба трэніраваць змалку.
7. як сталы ўжо чалавек;
8. я не ўмею гуляць у футбол.

**6. Падагульненне**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цэнтры апавядання “Страта”– чалавечыя ўзаемаадносіны, пачуцце вернасці, спагады, павагі да хворых. Сустрэча з Міцем стала для Стася экзаменам на сталасць.

Запіс на дошцы і ў сшытку па літаратуры наступных паняццяў:

спагадлівасць – уласцівасць спачування каму-небудзь;

дабрата – чуласць у адносінах да людзей;

міласэрнасць – схільнасць да спагады іншым, уменне рабіць дабро.

**7. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак**

**8. Рэфлексія**

Падыміце той малюнак, які адпавядаў вашаму настрою на ўроку:

9. Інфармацыя пра дамашняе заданне і інструктаж па яго выкананні

1. Перачытаць 1 і 2 часткі апавядання Генрыха Далідовіча «Страта».
2. Падрыхтаваць сціслы пераказ 1 і 2 частак апавядання (выкарыстоўваючы цытатную характарыстыку Міці).
3. Падрыхтаваць адказы на пытанні 1–4 на с. 87 вучэбнага дапаможніка.
4. Падабраць і запісаць у сшытак па літаратуры выказванні і прыказкі пра сяброўства.
5. Намаляваць партрэты галоўных герояў апавядання (па жаданні).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ